11. Наскалов, В. М. Организационно-методические основы профессионально-прикладной физической подготовки студентов вузов : метод. указ. для студентов всех специальностей / В. М. Наскалов. – Новополоцк, 1996. – 38 с.

12. Пасичниченко, В. А. Влияние физической культуры и спорта на формирование навыков, необходимых человеку в повседневной деятельности в зависимости от профессии / В. А. Пасичниченко, В. Н. Кудрицкий // Вестник БГТУ, сер. гуманитар. наук. – 2002. – № 6(18). – С. 125–129.

# ДОБРААХВОТНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ І ВАЛАНЦЁРСТВА Ў РЭАЛІЗАЦЫІ МАЛАДЗЁЖНАЙ ПАЛІТЫКІ АЗЕРБАЙДЖАНСКАЙ РЭСПУБЛІКІ

**Байко А. П.**
*старшы выкладчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (г. Мінск)*
**Байяліева Д. В.**
*студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (г. Мінск)*

***Анатацыя***. *Спецыфіка добраахвотнай дзейнасці і валанцёрства ў рэалізацыі маладзёжнай палітыкі аўтарамі артыкула прадстаўлена на прыкладзе Азербайджанскай Рэспублікі.*

***Summary***. *The specifics of volunteering and volunteering in youth policy implementation by the authors presented on the example of the Republic of Azerbaijan.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння ў Азербайджане моладзёжная палітыка з'яўляецца неад'емнай часткай дзяржаўнай палітыкі. Указам Прэзідэнта Азербайджана Гейдара Аліева 26 ліпеня 1994 г. было створана Міністэрства моладзі, спорту і турызму, а ў лютым 1995 г. па яго ініцыятыве адбыўся першы форум незалежнай моладзі Азербайджана. 1 лютага 1997 г. было падпісана распараджэнне пра абвяшчэнне «2 лютага – Днём азербайджанскай моладзі». З таго часу з мэтай далейшага ўдасканалення моладзевай палітыкі былі рэалізаваны: «Дзяржаўная праграма моладзі Азербайджана» (2005-2009-я гг.), якая прызвана была павышаць дзяржаўны клопат пра моладзь, «Дзяржаўная праграма па развіцці творчага патэнцыялу асабліва адораных дзяцей» (моладзі) (2006-2010-я гг.), «Дзяржаўная праграма па развіцці прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў Азербайджанскай Рэспубліцы» (2007-2012-я гг.). Вынікам стала тое, што за перыяд 2008-2011 гг. больш за 60% прынятых на працу ў дзяржаўныя органы склала моладзь; 11 моладзевых арганізацый Азербайджана сталі членамі міжнародных арганізацый. У рамках «Дзяржаўнай праграмы па навучанні азербайджанскай моладзі ў замежных краінах» у 2007-2015-я гг. 5000 студэнтаў адправіліся на вучобу ў аўтарытэтныя вышэйшыя навучальныя ўстановы свету.

У Азербайджане з 300 дзеючых няўрадавых арганізацый, колькасць тых, якія працуюць з дзецьмі і моладдзю, перавышае 120. Больш за палову гэтых НДА аб'ядналіся ў Нацыянальны Савет Моладзевых Арганізацый, які ў 2000 годзе быў абраны паўнапраўным членам Еўрапейскага Маладзёжнага Форуму, а са студзеня 2002 года атрымаў статус назіральніка Сацыяльна-Эканамічнага Савета ААН.

З мэтай урэгулявання адносін, якія ўзнікаюць у сферы неаплачанай грамадска-карыснай дзейнасці фізічных і юрыдычных асоб, у 2009 годзе быў прыняты Закон Азербайджанскай Рэспублікі «Аб добраахвотнай дзейнасці». Згодна з гэтым законам

добраахвотная дзейнасць ажыццяўляецца па наступных напрамках:

- аказанне дапамогі інвалідам, адзінокім, старым, малазабяспечаным сем'ям, бежанцам і вымушаным перасяленцам;
- прапаганда цярпімасці;
- прававая і культурная асвета;
- адукацыя, выхаванне, фізічнае і духоўнае развіццё дзяцей і моладзі;
- інфармаванне пра захворванні і эпідэміі;
- прапаганда здаровага ладу жыцця;
- ахова навакольнага асяроддзя;
- ахова гістарычных і культурных помнікаў, культурнай і духоўнай спадчыны;
- аказанне дапамогі ў ліквідацыі наступстваў узброеных канфліктаў, стыхійных бедстваў, прамысловых аварый, пажараў, эпідэмій і іншых надзвычайных сітуацый, у тым ліку асобам, якія пацярпелі ў выніку надзвычайных сітуацый;
- аказанне дапамогі асобам, вызваленым з устаноў па адбыванні пакарання, нарказалежных і іншым асобам (сем'ям) з цяжкімі ўмовамі жыцця і інш.

Разгледзім больш падрабязна, як рэалізуецца моладзевая палітыка праз прызму дзейнасці арганізацый. Старшыня найбуйнейшага ў краіне грамадскага аб'яднання «Ірэлі» [0] Міргасан Сяідаў падкрэслівае, што з моманту ўтварэння арганізацыя заўсёды падтрымлівала моладзевую палітыку дзяржавы, вылучаючы ў якасці прыярытэтных некалькі кірункаў: забеспячэнне ўдзелу моладзі ў працэсе прыняцця рашэнняў, абарона нацыянальна-маральных каштоўнасцей, забеспячэнне актыўнасці моладзі ў рэгіёнах. Варта падкрэсліць, што дзякуючы вернасці выбранаму курсу недзяржаўная арганізацыя за гэтыя гады ператварылася ў брэнд, які мае крыніцы ідэй, крэатыўны падыход і ўвесь час застаецца прывабным для азербайджанскай моладзі, якая працягвае ўступаць у арганізацыю. Так, у ГА «Ірэлі» налічваецца каля 26 тысяч удзельнікаў, 13 цэнтраў, 9 клубаў, і гэта не лічачы шматлікіх разавых праектаў, колькасць якіх пастаянна расце. Адзначым такасама, што ў гэтай арганізацыі ўся дабрачынная, валанцёрская і добраахвотная дзейнасці пачынаюцца з праекта. Калі той ці іншы праект становіцца папулярным, дае сацыяльны і інтэрактыўны эфект, то ён ператвараецца ў клуб. Калі ж клуб «разрастаецца», ён становіцца цэнтрам.

У офіс «Ірэлі» кожны дзень прыходзяць маладыя людзі з новымі праектамі. Супрацоўнікі аб'яднання іх сістэматызуюць з мэтай аб'яднання падобных ідэй, адпраўкі на дапрацоўку, каб з'явілася магчымасць рэалізацыі пэўнай ідэі ў жыццё. Напрыклад, у газеце «Бакінскі рабочы» распавядаецца пра звычайную дзяўчыну Дунью Фарзаліеву, якая стварыла і ажыццявіла праект, проста падаўшы заяўку ў «Ірэлі» і 15 лютага 2013 года ГА «Ірэлі» сумесна з Асацыяцыяй донараў крыві, ГА «Барацьба з лейкеміяй», дабрачынным форумам і гандлёва-забаўляльным цэнтрам «Park Bulvar» правяло дабрачынны канцэрт, прысвечаны Сусветнаму дню барацьбы з дзіцячым ракам. Дунья Фарзаліева з аўтара праекта стала кіраўніком валанцёраў з большай адказнасцю і ўзрослай колькасцю абавязацельстваў. Відавочна што гэты факт пацвярджае, што добраахвотнікі, прыходзячы ў арганізацыю, ўсведамляюць думку: каб увасобіць у рэальнае жыццё ўласныя праекты, акрамя ідэі, неабходна ўпартасць, мэтанакіраванасць і каманда аднадумцаў. І такіх прыкладаў вядома мноства.

Сярод папулярных у свой час праектаў можна вылучыць наступныя: «Зялёны горад», «Акадэмія развіцця асобы», «Мультыкультуралізм і талерантнасць», «Я малады!», «Зімовы ўніверсітэт маладых лідараў» і інш. За кошт вельмі эфектыўнай мадэлі навучання, якая падобная да гульні, за пяць гадоў свайго існавання праекты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Зімовы ўніверсітэт маладых лідараў» і «Летні форум юных лідараў» сталі вельмі папулярнымі сярод моладзі. Сто «студэнтаў» у «Зімовы ўніверсітэт маладых лідараў» адбіраюцца з дапамогай гутаркі з маладымі грамадзянамі Азербайджана, якія заяўляюць гатоўнасць добраахвотна ўдзельнічаць у рэалізацыі моладзевай палітыкі, і пры гэтым у іх ужо ёсць уласнае бачанне, як яе можна было б рэалізоўваць. Пасля праходжання гутаркі гэтыя 100 чалавек дзеляць на групы, якія на працягу працы ўніверсітэта (тыдзень) спаборнічаюць паміж сабой па самых розных «дысцыплінах»: кожны ўніверсітэт мае пэўную тэматыку, заняткі праводзяць эксперты з ліку міністраў, палітыкаў і аналітыкаў. Назва ж «Універсітэт лідараў» у дадзеным выпадку мае матывацыйны характар, у тым сэнсе, што ўдзельнікам можа стаць любы малады чалавек, які дбае пра перамогі і дасягненні. Пры гэтым усе заняткі праходзяць у форме гульні – гэта можа быць як аналаг папулярнай гульні «Што? Дзе? Калі?», так і, напрыклад, конкурс танца. У цэлым жа ва «ўніверсітэтах» пануе вельмі цёплая атмасфера энтузіязму, за кошт чаго і адбываецца прыцягненне ўсё больш новых «студэнтаў». Гэтым «універсітэт» адрозніваецца ад Форума юных лідараў, куды запрашаюцца тыя, хто ўжо дасягнуў пэўных вышынь у той ці іншай галіне. Сутнасць форума іншая: тут маладыя лідары абменьваюцца вопытам і ведамі, разважаючы на зададзеную форумам тэму. А ўлетку гэтага года ў Азербайджане стартаваў праект «Könüllülər Parlamenti – Azərbaycan» (Парламент валанцёраў – Азербайджан), арганізаваны ASAN Könüllüləri (Валанцёры ASAN) пры падтрымцы Савета дзяржпадтрымкі НВА пры Прэзідэнце Азербайджана [5]. Удзельнікі праекту ажыццяўляюць дзейнасць у складзе розных камітэтаў, арганізоўваюць дыспуты, прапануюць рашэнне праблем у розных сферах жыццядзейнасці краіны, сярод якіх адукацыя, прамысловасць, энергетыка, НДА і г.д.

Такі несур'ёзны, на першы погляд, падыход «Глядзіце моладзь гуляе ў палітыку!» прыносіць сур'ёзны вынік: у мясцовыя муніцыпалітэты за апошнія гады прыйшлі на працу 4 303 маладыя чалавекі (28%), з іх 326 сталі старшынямі муніцыпалітэтаў.

Яшчэ адзін напрамак рэалізацыі моладзевай палітыкі – прыцягненне моладзі да валанцёрскай працы па суправаджэнні спартыўных і культурных міжнародных падзейных мерапрыемстваў. Статыстыка сведчыць пра рост сярод моладзі цікавасці да дадзенага віду валанцёрскай дзейнасці, і гэта натуральна, бо кіраўніцтва краіны высока ацэньвае дзейнасць валанцёраў. Пацвярджэннем служыць той факт, што прадстаўнікі моладзі, прыняўшы ўдзел у якасці валанцёраў у буйнамаштабных мерапрыемствах, якія прымаў Азербайджан, дасягаюць добрых кар'ерных поспехаў. «У Азербайджане валанцёрская дзейнасць моладзі ператварылася ў традыцыю», – было адзначана пры падпісанні дамовы паміж валанцёрскай праграмай Гран-пры Еўропы Формула-1 і праграмай студэнтаў-валанцёраў Міністэрства адукацыі Азербайджана [5].

Згодна з заканадаўствам [3], арганізатары добраахвотнай або валанцёрскай дзейнасці ў Азербайджанскай Рэспубліцы маюць магчымасць запрасіць замежных грамадзян для ажыццяўлення добраахвотнай дзейнасці, але толькі пры ўмове, калі займацца ёю на тэрыторыі Азербайджанскай Рэспублікі яны будуць сумесна з арганізатарамі. Усё гэта спрыяе прыцягненню замежных валанцёраў і рэалізацыі міжнародных валанцёрскіх праектаў і праграм. Напрыклад, на I Еўрапейскіх гульнях у 2015 годзе ў Баку ў ліку больш як 12 тысяч валанцёраў з розных краін упершыню працавалі прадстаўнікі Туркменістана (дваццаць маладых людзей, у асноўным студэнты, якія з'яўляюцца членамі валанцёрскіх цэнтраў, створаных пры вышэйшых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навучальных установах).

У азербайджанскіх СМІ штотыдзень знаходзяць адлюстраванне шматлікія і розныя добраахвотныя, валанцёрскія і дабрачынныя мерапрыемствы, якія рэалізуюцца ў моладзевым сектары, як лагічны вынік дзейнасці дзяржавы ў сферы павышэння патэнцыялу моладзі. Мы канстатуем, што ў Азербайджане моладзевая палітыка ператварылася ў важны элемент дзяржаўнай палітыкі краіны, пры якой рэалізуюцца праекты, разлічаныя на раскрыццё патэнцыялу моладзі, плённае ажыццяўленне яе ідэй. Пры гэтым для паспяховай рэалізацыя моладзевай палітыкі ў Азербайджанскай Рэспубліцы створаны магутны падмурак і актыўна выкарыстоўваецца патэнцыял не толькі нацыянальных, але і міжнародных рэсурсаў добраахвотнай дзейнасці і валанцёрства.

Аднак даследаванне Фонду падтрымкі і развіцця філантропіі CAF 2016 года выяўляе існаванне неадпаведнасці ў зацікаўленасці дзяржавы і намаганняў, якія яна прыкладае да рэалізацыі моладзевай палітыкі, і гатоўнасцю звычайных маладых людзей аддаваць грошы на розныя дабрачынныя праекты і займацца бясплатнай валанцёрскай працай. Са 140 краін свету, у якіх фондам CAF даследаваўся дадзены аспект чалавечай шчодрасці і дапамогі бліжняму, Азербайджан у самым канцы рэйтынгу – 131-е месца: у рэспубліцы толькі 33 % тых, хто дапаможа незнаёмцу (130-я пазіцыя ў агульным рэйтынгу), 12 % – гатовых дзяліцца грашыма (127-е месца) і толькі 17% апытаных працавалі валанцёрамі (87-я пазіцыя ў агульным рэйтынгу) [8, с. 36-38]. Такім чынам, нягледзячы на вышэйахарактарызаваныя факты, у Азербайджанскай Рэспубліцы застаецца актуальнай праблема папулярызацыі добраахвотнай дзейнасці і валанцёрства сярод розных груп насельніцтва; у рамках рэалізацыі моладзевай палітыкі мэтазгодна і перспектыўна прыцягваць маладых азербайджанскіх грамадзян да гэтай справы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Бакинский рабочий [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.br.az/mnenie/20130221111341529.html#page2ю. – Дата доступа : 12.09.2016.

2. Ирели: портал общественного объединения [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://ireli.az. – Дата доступа : 01.09.2016.

3. О добровольной деятельности: Закон Азербайджанской Республики // Азербайджан. – 2009. – № 164 (29 июля).

4. Студенты-волонтеры помогут в проведении Гран-при Европы Формула-1 в Баку // Trend News Agency [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.trend.az/azerbaijan/society/2504034.html. –Дата доступа : 11.09.2016.

5. Туркменские волонтеры будут набираться опыта на первых Европейских играх в Баку // Новости Туркменистана [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://infoabad.com/sport-i-turizm-turkmenistana/turkmenskie-volontery-budut-nabiratsja-opyta-na-pervyh-evropeiskih-igrah-v-baku.html. – Дата доступа : 09.09.2016.

6. Azerbaijan Realiteis [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://a-r.az/ru. – Дата доступа : 12.09.2016.

7. CAF World Giving Index 2016. The world's leading study of generosity October 2016 [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.cafonline.org/docs/default-source/about-us-publications/1950a_wgi_2016_report_web_v2_241016.pdf. – Дата доступа : 15.09.2016.